# Палітычныя погляды кампазітара Ю. Дашчынскага ў святле вядомых фактаў

*Жаканава К. А., магістрант ІПНК НАН Беларусі,*
*нав. кір. Ліхач Т. У., канд. мастацтвазнаўства, дац.*

Юзаф Дашчынскі (1781–1844) — персаналія, чыё імя пачало адраджацца толькі напрыканцы мінулага стагоддзя ў галіне музыказнаўства. Але асоба Дашчынскага — кампазітара, дырыжора, педагога, грамадскага дзеяча — не абмежавана выключна музыкай. Нешматлікія факты раскрываюць і іншую іпастась Дашчынскага, якая была прадыктавана палітычнымі ўзрушэннямі таго часу.

Жыццё і творчасць кампазітара выпала на перыяд вайны 1812 г. Як адзначае А. Л. Пагодзін: «Стан Літвы [у той час. **Заўв. аўт.** — К. Ж.] быў у вышэйшай ступені нявызначаны» [1;162]. З аднаго боку, Аляксандр І спрыяў развіццю літоўскіх і беларускіх губерняў, з іншага — яго распараджэнні часам супярэчылі лаяльнай да гэтых зямель палітыцы. Такая сітуацыя тлумачыць дваістасць фактаў біяграфіі Дашчынскага.

Так, у некралозе кампазітара адзначана, што ў 1811 г., падчас прыезду імператара Аляксандра І, Ю. Дашчынскі граў у яго пакоях, а за адно з сачыненняў, прысвечаных яго вялікасці, ён атрымаў у дар брыльянтавы пярсцёнак (звычайна ў якасці ганарару музыкантам імператары дарылі брыльянтавыя пярсцёнкі з ювелірных запасаў Кабінета Я. І. В. [Яго Імператарскай Вялікасці] [2]. Але на наступны год Дашчынскі ўступіў у Віленскую нацыянальную гвардыю, якая была створаная Напалеонам. Гісторык і пісьменнік А. Тарас дае наступныя звесткі аб ёй: «Нацыянальная гвардыя прызначалася для падтрымання парадку ў гарадах і мястэчках, аховы дзяржаўнай і прыватнай уласнасці, казны дэпартаментаў і дыстрыкту, а таксама важных аб’ектаў (складоў і мастоў) <…>. Служба ў нацыянальнай гвардыі была абвешчаная абавязковай для ўсіх гараджан мужчынскага полу, якія валодалі нерухомасцю, і запісаных у гарадскую кнігу, ва ўзросце ад 18 да 50 гадоў <…>. Гвардзейцы жылі ў сябе дома, але ў названыя ім дні выходзілі на патруляванне тэрыторыі, а па нядзелях збіраліся для ваеннага навучання, якое праводзілі польскія афіцэры» [3; 146–148]. Такім чынам, можна меркаваць аб палітычных сімпатыях кампазітара да напалеонаўскай арміі, што было характэрным і для значнай часткі арыстакратыі беларускіх зямель.

Як сведчаць гісторыкі, «удзелу ў баявых дзеяннях гвардзейцы не прымалі, за выключэннем віленскіх, якія абаранялі 10–12 снежня свой горад ад рускіх войскаў» [3; 148]. Таму з вялікай верагоднасцю кампазітар прымаў удзел у баях. А калі ў снежні 1812 г. Вільна зноў трапіла пад уладу Расіі, выйшла распараджэнне, «каб нацыянальныя гвардзейцы працягвалі несці сваю службу» [3; 74]. Але Дашчынскі адразу падае ў адстаўку, не жадаючы працягваць

службу пад новай уладай па прычыне таго, што, «не маючы ніякіх да таго здольнасцей, займаючыся цэлае жыццё аднымі фартэпіянамі, з'яўляюся цалкам нягодным і бескарысным» (поўнае прашэнне гл. у крыніцы [4; 88–91]).

Акрамя таго, існуе яшчэ адно выданне, якое ўскосна гаворыць аб палітычных поглядах Ю. Дашчынскага: «Спіс імёнаў людзей, якія зрабілі ахвяраванні на помнік Тадэвушу Касцюшку» (1822) [5].

Такім чынам, непаслядоўная пазіцыя Імператара Аляксандра І адносна беларускіх зямель, аб чым сказана ў шматлікіх гістарычных даследаваннях, тлумачаць дваістыя адносіны да яго палітыкі ў інтэлігенцыі гэтых зямель. Гэта бачна на прыкладзе Ю. Дашчынскага, які прыватна іграў на раялі ў пакоях імператара, але выступаў на баку напалеонаўскай арміі.

Ваенная тэматыка знайшла ўвасабленне непасрэдна і ў кампазітарскай творчасці. Як адзначае Д. Ходзька, Дашчынскі напісаў некалькі маршаў і «з іх два пасвяціў Напалеонаўскай кароннай гвардыі польскіх уланаў, шырока вядомай як гвардыя Красінскага» [6].

**Літаратура**

1. Погодин, А. Л. Наполеон и Литва / А. Л. Погодин // Отечественная война и русское общество. 1812–1912 гг. ; ред. А. К. Дживелегов и др. — Т. 3. — СПБ., 1912. — С. 162–170.

2. И. Г., Некролог. Прибавления к виленскому вестнику [Электронны рэсурс] / И. Г. // — 1844. — 15 декабря. — №177. — Режим доступа: https://jbc.bj.uj.edu.pl/dlibra/publication/467437/edition/442638/content. — Дата доступа: 02.10.2019.

3. Тарас, А. 1812 г. — трагедия Беларуси / Анатоль Тарас. — Минск : Харвест, 2018. — С. 146–148.

4. Татищев, Ю. В. Вильна и Литовские губернии в 1812–1913 гг. : сб. док. арх. Упр. виленского ковенского и гродненского ген.-губернатора / Ю. В. Татищев. — Вильна : Губ. тип., 1913. — С. 88–91.

5. Lista jmienna osob, składających ofiary na pomnik Tadeusza Kościuszki : wydana przez komitet zarządzający budowa tegóż, od dnia 17 grudnia 1821 roku [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: https://crispa.uw.edu.pl/object/files/239982/display/Default. — Дата доступу: 14.03.2019.

6. Pług, A. O Józefe Deszczyńskim [Электронны рэсурс] / A. Pług // Ruch Muzyczny. — 1859. — Nr.50. — Рэжым доступу: https://crispa.uw.edu.pl/object/files/415118/display/Default. — Дата доступу: 24.03.2021.